# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ, З ДНЁМ ВЕДАЎ!

*Напачатку самыя шчырыя і цёплыя словы мы адрасуем першакурснікам – тым юнакам і дзяўчатам, якія ў напружанай конкурснай барацьбе найбольш паспяхова вытрымалі ўступныя экзамены і заваявалі права заняць месца ў вядучай вышэйшай навучальнай, навуковай і культурнай установе Беларускага Палесся.*

*Сёлетняе папаўненне студэнцкай сям'і – самае шматлікае за 31 год існавання нашага універсітэта. Для яго гісторыі характэрна і яшчэ адна акалічнасць: быў устаноўлены рэкордны конкурсны паказчык. На кожную бюджэтную студэнцкую вакансію прэтэндавалі 2,47 абітурыента. З улікам паступіўшых на вучобу ў ГДУ на платнай аснове кожны другі стаў яго студэнтам.*

*Для цяперашніх першакурснікаў адметнай падзеяй стане тое, што набываць вышэйшую адукацыю яны пачнуць у апошні год XX стагоддзя, а стануць спецыялістамі ўжо ў новым XXI стагоддзі, якое ад кожнага з іх запатрабуе сапраўды фундаментальных ведаў і вялікіх практычных навыкаў.*

*Мы жадаем вам, дарагія першакурснікі, быць вартымі свайго часу, ва ўсіх сферах уласнай шматграннай дзейнасці даражыць гонарам роднай alma mater, высока трымаць яе марку.*

*Горача віншуем з новым навучальным годам і Днём ведаў усіх студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Няхай спадарожнічаюць вам поспехі ў вучобе і працы, нікога не падводзіць здароўе, расце асабісты і сямейны дабрабыт.*

**РЭКТАРАТ, ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА.**

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 12 (986) | ПЯТНІЦА, 1 верасня 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## З ГАНАРОВЫМ ЗВАННЕМ!

*За заслугі ў развіцці фізкультуры і спорту, вучэбна-трэніровачнай і выхаваўчай рабоце па падрыхтоўцы спартсменаў высокага класа загадчык кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры, дэкан факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта НАРСКІН Генадзь Іванавіч Указам Прэзідэнта ўдастоены ганаровага звання "Заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту Рэспублікі Беларусь".*




Вікторыя Шундзікава стала першакурсніцай геолага-геаграфічнага факультэта. Яна – будучы эколаг.

## АБ ПРЭСТЫЖЫ ГОМЕЛЬСКІХ ВНУ

### (па дадзеных прыёмных камісій)

У горадзе над Сожам сёння пачнуць вучобу першакурснікі шасці вышэйшых навучальных устаноў. Аб іх прэстыжы ў поўнай, калі не вызначальнай, ступені сведчаць конкурсныя паказчыкі на ўступных экзаменах.

Сёлета пазіцыю лідэра надзейна ўтрымліваў Гомельскі медыцынскі інстытут. За кожнае бюджэтнае месца тут змагаліся 3,52 абітурыента. Але варта ўлічваць, што ў ГМІ самы малалікі планавы набор студэнтаў. Напрыклад, у параўнанні з нашым універсітэтам ён у 5,4 раза меншы.

Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны па праву лічыцца вядучай навучальнай і навуковай установай Беларускага Палесся. У ГДУ – найбольшая колькасць факультэтаў, спецыяльнасцей і спецыялізацый, а бюджэтны набор першакурснікаў дасягнуў 1000 чалавек, конкурс – 2,47.

За апошнія гады прыкметна павысіўся рэйтынг Гомельскага тэхнічнага універсітэта імя П.О.Сухога. На прайшоўшых уступных экзаменах тут сярэдні конкурс складаў 2,40 чалавека на месца.

Конкурсная барацьба адчувалася і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту. Стаць першакурснікам мог толькі кожны другі з паступаўшых.

Без асаблівай напругі ішоў прыём у Гомельскі кааператыўны інстытут, дзе падрыхтоўка спецыялістаў у асноўным ажыццяўляецца па мэтавых накіраваннях і на платнай аснове. Як вынік, тут быў самы нізкі конкурс – 1,19 чалавека на месца.

Асобна хочацца сказаць пра самую маладую ВНУ Гомеля – вышэйшае інжынерна-пажарнае вучылішча Міністэрства надзвычайных сітуацый. Адбор у ГВІПВ мае свае патрабаванні. Тым не менш, каб стаць яго курсантамі, за кожнае месца змагаліся па чатыры абітурыенты. На вучобу залічаны 60 фізічна развітых юнакоў, якія да таго ж паказалі добрыя веды на ўступных экзаменах.

## ...І БЕЛАРУСІ

Як паведамлялася ў рэгіянальным выпуску газеты "Труд" у Беларусі (за 17 жніўня г.г.), сёлета абітурыенты, як кажуць, мелі шырокі выбар – 233 спецыяльнасці і 1050 спецыялізацый. На 24205 навучальных вакансій прэтэндавалі 65014 жадаючых. У сярэднім конкурс па краіне ў ВНУ складаў 2,7 чалавека на месца. У бой за ведамі ўступілі 6554 медалісты (дарэчы, 15% з іх атрымалі на ўступных экзаменах "двойкі" – дзе ваш гонар, настаўнікі?).

Самы вялікі рост жадаючых стаць высокаадукаванымі спецыялістамі адзначаны ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (з 7,5 чалавека на месца ў мінулым годзе да 11,8 – у цяперашнім). Лячыць людзей імкнуліся раней 3,3 абітурыента на месца, на гэты раз – 3,9. Прыкладна такія ж вынікі ў БДУ, тэатральнай і музычнай акадэміях.

Нездавальняючыя адзнакі на экзаменах атрымалі больш за 3200 чалавек.

... Магчыма, кагосьці абрадавала тое, што колькасць нездавальняючых адзнак за сачыненне на роднай беларускай мове зменшылася ў параўнанні з леташнім з 14 да 9%. Але 30% абітурыентаў не здолелі справіцца з экзаменам па рускай мове...

# СТАНУЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТАМІ НОВАГА СТАГОДДЗЯ

## *Да вынікаў уступных экзаменаў-2000 у ГДУ*

*Сёлета сярэднія школы Беларусі выпусцілі на сем тысяч юнакоў і дзяўчат больш, чым летась. І заканамерна, што колькасць жадаючых атрымаць вышэйшую адукацыю, як сведчаць сродкі масавай інфармацыі, павялічылася на 5 тысяч чалавек. Толькі ў дзяржаўныя ВНУ рэспублікі спрабавалі паступіць звыш 65 тыс. абітурыентаў. Агульны конкурс па краіне склаў 2,7 чалавека на месца. За апошнія 10 гадоў гэта самы высокі конкурсны паказчык. Такі "вучэбны бум" сацыёлагі звязваюць з дэмаграфічным успляскам канца 80-ых гадоў.*

*Па дадзеных Галоўнага ўпраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Мінадукацыі ў параўнанні з мінулым годам конкурс павялічыўся ў 29 дзяржаўных ВНУ Беларусі з 42.*

Да ліку тых, дзе сёлета прыкметна ўзрасла колькасць абітурыентаў, адносіцца і наш універсітэт. На гэты раз яго студэнтамі імкнуліся стаць 2470 маладых людзей – на 599 больш, чым у мінулым годзе. На кожнае з 1000 бюджэтных месцаў прэтэндавалі 2,47 чалавека. Летась было 1,96. Цяперашні конкурс – самы высокі за ўвесь час існавання ГДУ.

Падрыхтоўка да ўступных экзаменаў і іх правядзенне праходзілі ў адпаведнасці з міністэрскімі патрабаваннямі на належным арганізацыйным узроўні. Для абітурыентаў, іх бацькоў і ўсіх зацікаўленых асоб была прадстаўлена самая шырокая інфармацыя.

Як і ў папярэднія гады, за ходам уступных экзаменаў з мэтай забеспячэння абітурыентам роўных правоў і магчымасцей для паступлення ва універсітэт ажыццяўляўся пастаянны кантроль аўтарытэтных дзяржаўнай і грамадскіх камісій.

### Новаўвядзенні

Асноўная з іх – ацэнка экзаменаў па 6-бальнай сістэме па ўсіх дысцыплінах: 2; 3; 3,5; 4; 4,5; 5. Прычым патрабавалася даваць пісьмовы адказ і па вусных экзаменах. Гэта дазваляла больш аб'ектыўна

(ПРАЦЯГ на 2-3 стар.)

## У РЭДАКЦЫІ – НОВЫ АДРАС

Даводзім да ведама студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў, усіх аўтараў і чытачоў нашай газеты, што нядаўна яе рэдакцыя атрымала "новую прапіску". Цяпер нас можна адшукаць у вучэбным корпусе № 3 па вул.Песіна, 80, п.2-14.

# СТАНУЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТАМІ НОВАГА СТАГОДДЗЯ

## *Да вынікаў уступных экзаменаў-2000 у ГДУ*

(ПРАЦЯГ. ПАЧАТАК на 1-й стар.)

ацэньваць веды іспытуемых, пазбягаць неабгрунтаваных скарг і апеляцый.

Пачалі істотна адрозніваццца прахадныя балы. Па філалагічных спецыяльнасцях яны падсумоўваліся па ўсіх здадзеных экзаменах, па астатніх — толькі па прафілюючых. Пісьмовыя работы па мове і літаратуры на апошніх ішлі як заліковыя.

На спецыяльнасці "Англійская мова", "Нямецкая мова", "Правазнаўства" абітурыенты здавалі па чатыры экзамены, на ўсе астатнія — па тры.

З гэтага года на філалагічным факультэце пачаты набор на "Беларускую мову і літаратуру" са спецыялізацыяй "Літаратурная праца ў газетах і часопісах". Абітурыенты спачатку праходзілі субясэдаванне, а затым здавалі тры конкурсныя экзамены. Прахадны бал складаўся з чатырох адзнак.

На спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве", "Правазнаўства" быў устаноўлены паасобны прахадны бал для гарадскіх і сельскіх абітурыентаў, а на спецыяльнасці "Прыкладная матэматыка" — у залежнасці ад абранай спецыялізацыі.

### У каго які прэстыж?

І на гэтае пытанне дазваляюць адказаць справаздачныя дадзеныя прыёмнай камісіі. Паколькі ўзрасла колькасць абітурыентаў-2000 ва універсітэце ў цэлым, дык гэта характэрна, хаця не ў аднолькавай ступені, для кожнага факультэта ў асобнасці. Лідзіруючую пазіцыю тут заняў эканомфак. Набываць адну з пяці яго спецыяльнасцей пажадалі 437 юнакоў і дзяўчат — на 166 больш, чым летась. Сярэдні конкурс — 3,48 чалавека на месца.

Па-ранейшаму шмат жадаючых набываць вышэйшую адукацыю было на спецыяльнасцях філфака, матэматычнага профілю, па псіхалогіі, біялогіі, фізічнай культуры і спорту, правазнаўству. За апошнія гады прыкметна ўзняўся прэстыж такой спецыяльнасці як "Геаграфія".

Да гэтага часу найменш запатрабавальным з'яўляецца фізічны факультэт. Праўда, сёлета і тут прыбавілася абітурыентаў, але не значна. На 125 вакансій пяці спецыяльнасцей было пададзена ўсяго 205 заяў — 1,64 на адно месца.

У параўнанні з мінулым годам убавілася абітурыентаў толькі на дзвюх спецыяльнасцях: "Беларуская мова і літаратура" — на 6 чалавек, "Правазнаўства" — на 9. Дарэчы, на апошняю спецыяльнасць конкурс зменшыўся на адну дзясятую, на "Сусветную эканоміку і міжнародныя эканамічныя адносіны" — на 0,35.

А вось на педагагічнае аддзяленне фізічнага факультэта сёлета была пададзена раўназначная колькасць заяў з леташняй: 33 на 25 бюджэтных месц.

### Вышыня конкурсных планак

Як заўжды яна залежала ад наплыву абітурыентаў на адпаведную спецыяльнасць. Сёлета найбольшая колькасць прэтэндэнтаў на адно месца — 4,2 (летась — 2,5) — была на "Эканоміку і кіраванне на прадпрыемстве". Другі паказчык склаўся на "Фінансы і крэдыт" — 3,96 (у мінулым годзе — 2,2). Па 3,88 чалавека на месца прыпадала на спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" і "Псіхалогія" (летась адпаведна — 2,0; 2,4). Пяцёрку самых прэстыжных спецыяльнасцей замкнула спецыяльнасць "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт" — 3,72 (2,85).



На пісьмовым экзамене.

Усё большую папулярнасць набывае спецыяльнасць "Экалогія". Тут сёлета конкурс павялічыўся ў 1,8 раза. За права заняць адно з 3 планавых бюджэтных месц змагаліся па 3,6 чалавека. Прыхільнай для абітурыентаў стала камерцыйная дзейнасць. На кожнае месца гэтай спецыяльнасці прэтэндавалі 3,4 абітурыента (летась — 2,25).

Паступаючыя на матэматычны факультэт аддалі перавагу прыкладной матэматыцы вытворчага аддзялення — 2,92 (1,90) чалавека на месца. Усяго толькі на чатыры сотыя гэты паказчык аказаўся меншым на спецыяльнасці "Геаграфія" і ў параўнанні з мінулагоднім узрос на 46 працэнтаў.

Пастаянная стабільнасцю вызначаецца факультэт фізічнай культуры. Сёлетні яго паказчык — 2,83 чалавека на месца (у 1999 г. — 2,55). На 0,74 у параўнанні з леташнім узрос конкурсны паказчык на вытворча-педагагічнае аддзяленне прыкладной матэматыкі і дасягнуў адзнакі 2,64.

Адчувальна ўзрасла колькасць жадаючых набываць спецыяльнасць "Руская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура": з 1,8 чалавека на месца ў мінулым годзе да 2,56 — у гэтым.

На астатнія 17 спецыяльнасцей конкурс склаўся меншым за сярэдненіверсітэцкі. Ён быў (у параўнанні з леташнім): "Руская мова і літаратура" — 2,46 (2,0); "Біялогія" — 2,31 (1,9); "Нямецкая мова" — 2,28 (2,1); "Англійская мова" — 2,24 (1,75); "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны" — 2,2 (2,55); "Правазнаўства" — 2,15 (2,25); "Беларуская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Англійская мова" — 2,12 (1,6); "Гісторыя" — 2,12 (1,7); "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" — 2,08 (1,3); "Беларуская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Літаратурная праца ў газетах і часопісах" — 2,0; "Гісторыя" з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова" — 1,92 (1,4); "Геалогія і разведка карысных выкапняў" — 1,92 (1,5); "Фізічная электроніка" — 1,72 (1,5); "Фізіка (вытворчае аддзяленне)" — 1,56 (1,3) і "Фізіка" з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць" — 1,52 (1,2); "Фізіка (педагагічнае аддзяленне)" — 1,32 (1,2).

### Хвалюючыя прахадныя балы

Яны становяцца вядомымі пасля таго, як здадзены ўсе экзамены і самымі высокімі з'яўляюцца для тых, хто не мае ніякіх ільгот. На гэты раз даволі складаным было выправабаванне па агульнаму конкурсу для тых, хто паступаў на спецыяльнасць "Англійская мова". Ім трэба было набраць пры чатырох экзаменах 19 балаў (летась — 17,5) з 20 магчымых. Для тых, хто будзе вывучаць нямецкую мову, як і ў мінулым годзе, хапіла 17 балаў. Паступаючым на "Беларускую мову і літаратуру" са спецыялізацыяй "Літаратурная праца ў газетах і часопісах", каб стаць першакурснікам, неабходна было набраць 16,5 бала.

Пры трох конкурсных экзаменах 13,5 бала (летась — 11,5) забяспечвалі бюджэтнае месца на спецыяльнасць "Руская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура", 13 балаў — на спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" (12,0) і "Руская мова і літаратура" (11,5).

Тры конкурсныя экзамены пры адным заліковым абітурыенты здавалі на спецыяльнасць "Правазнаўства". Месца студэнта гарантавалі для выпускнікоў з горада 12,5 набраных бала, вёскі — 11.

Пры двух конкурсных экзаменах самы высокі прахадны бал — 9 з 10 — склаўся на спецыяльнасці "Псіхалогія", "Фізічная культура і спорт", "Гісторыя" з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова", "Біялогія".

8,5 набраных бала дазволілі набываць вышэйшую адукацыю ў нашым універсітэце па спецыяльнасцях "Фінансы і крэдыт", "Экалогія", "Геаграфія", на вытворча-педагагічным аддзяленні прыкладной матэматыкі.

Радасць поспеху прынеслі восем балаў для паступаючых на спецыяльнасці: "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" (для абітурыентаў горада), "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт", "Гісторыя", "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі", "Фізічная электроніка".

7,5 бала сталі прахаднымі на спецыяльнасці: "Камерцыйная дзейнасць", "Матэматыка", "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны", 7 балаў — на "Фізіку (вытворчае аддзяленне)", "Геалогію і разведку карысных выкапняў".

Самы нізкі конкурс — 6,5 бала — склаўся для сельскіх абітурыентаў, якія паступілі на спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве", "Фізіка (педагагічнае аддзяленне)" і "Фізіка" з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць".

### Паказчык якасці ведаў

Калі меркаваць па атэстатах сталасці, дык пераважная большасць абітурыентаў пры паступленні ва універсітэт мела грунтоўную школьную падрыхтоўку. І хоць кажуць, што ўступныя экзамены — латарэя, але гэта далёка не так. Пашанцаваць можа ў выключных выпадках. Увогуле ж поспех спадарожнічае тым, хто мае трывалыя веды, не губляецца пры адказных і вельмі хвалюючых выправабаваннях.

Сёлета ўступныя экзамены вытрымалі 66,9 % абітурыентаў. Гэты паказчык на 1,9% ніжэйшы за леташні. Лічба, якая перавышае сярэдненіверсітэцкі ўзровень паспяховасці абітурыентаў, дасягнута пры іх паступленні на 14 спецыяльнасцей з 29. Лепшы вынік у паступаючых на "Гісторыю" з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова". З 48 кандыдатаў на студэнцкае месца тут вытрымалі экзамены 43 чалавекі. 85,4 % склала паспяховасць паступаючых на "Геалогію і разведку карысных выкапняў"; 84,9% — на "Беларускую мову" са спецыялізацыяй "Англійская мова"; 84,8% — на педагагічнае аддзяленне спецыяльнасці "Фізіка".

Варта сказаць і пра спецыяльнасць "Руская мова і літаратура". На яе падалі заявы 123 абітурыенты і 100 з іх здалі ўсе экзамены, але студэнтамі бюджэтнага фінансавання сталі толькі 50 чалавек.

Вышэй мы адзначалі, што самы высокі конкурс сёлета быў на эканамічным факультэце. І ў процілегласць тут зафіксаваны самы нізкі сярэдні ўзровень паспяховасці — усяго 53,3 %. А на такіх спецыяльнасцях як "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве", "Камерцыйная дзейнасць" ён быў яшчэ ніжэйшым — адпаведна 40,9 і 49,4 %. У гэтых лічбах



Старт да студэнцкага п'едэстала. Нарматывы па фізічнай падрыхтоўцы здаюць абітурыенты факультэта фізічнай культуры.

# СТАНУЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТАМІ НОВАГА СТАГОДДЗЯ

## *Да вынікаў уступных экзаменаў-2000 у ГДУ*

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК на 1-2 стар.)



**На душы ў Юрыя Скрыпко радасна, а на выгляд ён вельмі сур'ёзны, у чым і заўважаюцца рысы будучага юрыста.**

высвецілася слабая падрыхтоўка многіх абітурыентаў па матэматыцы.

### Медалі рознай пробы

Даказана практыкай, што веды многіх медалістаў сярэдніх школ далёка не адпавядаюць сучасным патрабаванням. Аднак колькасць іх уладальнікаў з кожным годам павялічваецца. Таму льготы для гэтай катэгорыі абітурыентаў, можна сказаць, ужо зведзены да мінімуму. Тым не менш наплыў медалістаў і ў наш універсітэт працягвае ўзрастаць. Сёлета на ўсе спецыяльнасці (за выключэннем "Фізікі" з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць") ад іх было пададзена 554 заявы. Гэта на 170 больш, чым у мінулым годзе. На экзаменах свае глыбокія веды пацвердзілі 345 медалістаў, якія сталі першакурснікамі. А вось 209 уладальнікаў ганаровых школьных узнагарод (у працэнтных адносінах больш чым у любым папярэднім годзе), як кажуць, "засталіся за бортам".

Сярод медалістаў найбольш падрыхтаванымі аказаліся паступаючыя на "Англійскую мову". З 38 такіх абітурыентаў 34 сталі студэнтамі.

Усе медалісты (адпаведна 5 і 4) залічаны на педагагічнае аддзяленне фізічнага факультэта і факультэт фізічнай культуры. Высокі працэнт паступіўшых медалістаў на такія спецыяльнасці як "Беларуская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Літаратурная праца ў газетах і часопісах", "Беларуская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Англійская мова", "Руская мова і літаратура", "Нямецкая мова", "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі".

На спецыяльнасці "Фінансы і крэдыт", "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт", "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве", вытворчае і вытворча-педагагічнае аддзяленні прыкладной матэматыкі пры бюджэтным наборы па 25 чалавек на студэнцкія месцы прэтэндавалі адпаведна 34; 28; 28; 29 і 28 медалістаў. У пералічаным парадку па выніках экзаменаў гэта права заваявалі 13; 12; 11; 13 і 14 такіх абітурыентаў.

І яшчэ: 20 медалістаў з 54 не змаглі паступіць на спецыяльнасць "Правазнаўства", палавіна з 22 — на "Псіхалогію", 14 з 43 — на "Біялогію", 8 з 15 — на "Экалогію". Але больш за ўсё здзівілі медалісты, якія жадалі вывучаць беларускую мову і літаратуру. Тут дасягнуць пастаўленай мэты здолеў толькі адзін медаліст з дзесяці паступаўшых. Відавочна, аказаліся вельмі нізкай пробы медалі, выдадзеныя выпускнікам сельскіх школ.

Па сутнасці не парадавалі і тыя абітурыенты, якія мелі дыпломы з адзнакай сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ПТВ. Ад іх пропуск на вучобу ў наш універсітэт атрымалі 8 чалавек з 21 здаваўшага экзамены.

### Толькі лічбы

• Па сумешчаных экзаменах пасля падрыхтоўкі да паступлення ва універсітэт яго першакурснікамі залічаны 53 чалавекі.

• Па мэтаваму кантрактнаму набору здавалі экзамены 428 абітурыентаў і 317 з іх прыняты на запланаваныя бюджэтныя месцы.

• Сярод сёлетніх першакурснікаў — 3 пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд.

• Студэнтамі універсітэта сталі 109 ліцэістаў і гімназістаў з паступаўшых 195.

• Ва універсітэт паступалі 2026 выпускнікоў гарадскіх і 444 — сельскіх школ. Студэнтамі сталі 785 і 215 чалавек, што складае адпаведна 38,7 і 48,4 %.

• 17 абітурыентаў мелі працоўны стаж не менш двух гадоў, але толькі адзін з іх здолеў стаць студэнтам.

• Першакурснікамі універсітэта марылі стаць 51 чалавек з-за межаў нашай краіны, на што ёсць адпаведныя дагаворы. На экзаменах пашчасціла кожнаму трэцяму з іх.

• Дадаткова да планавага набору ва універсітэт прынята за поўную аплату навучання звыш 200 юнакоў і дзяўчат.

**Публікацыю падрыхтаваў да друку Ул.Балога па справаздачных матэрыялах прыёмнай камісіі універсітэта.**

**Фота Ул.ЧЫСЦІКА.**

---

ЗАПАМІНАЛЬНЫЯ ПАЕЗДКІ



# ТВАР ДА ТВАРУ З ЗША

Сёлета група кіраўнікоў малога і сярэдняга бізнесу, а таксама грамадскіх арганізацый Гомельшчыны наведала Злучаныя Штаты Амерыкі. На працягу месяца гамяльчане праходзілі стажыроўку, знаёміліся з бізнесам ЗША, дзейнасцю грамадскіх арганізацый гэтай краіны.

Сярод удзельнікаў дэлегацыі былі і кандыдат гістарычных навук, дацэнт гістарычнага факультэта нашага універсітэта, эксперт фонда імя Л.Сапегі Ігар Віктаравіч Нямкевіч і кандыдат біялагічных навук, дацэнт біялагічнага факультэта, актывіст грамадскай экалагічнай арганізацыі "Палессе" Мікалай Міхайлавіч Дайнэка. Аб цікавай і вельмі карыснай паездцы яны дзеляцца сваімі ўражаннямі.

**І.В.НЯМКЕВІЧ:**

— Ад стажыроўкі ў ЗША я вынес суперурок, які можна ўмоўна падзяліць на два ўзроўні: прыкладны і метафізічны. Што я маю на ўвазе?

Урок першы. Гэта тыя практычныя навыкі, тыя канкрэтныя тэхналогіі і методыкі, якія цалкам прымяняльныя ў нашых умовах і якія вельмі часта супадалі з тым, што мы робім у сябе. І гэта было прыемным адкрыццём.

Урок другі. Розныя людзі ў розных сітуацыях рознымі словамі аднадушна спрабавалі данесці да нашай свядомасці просты тэзіс: да таго часу, пакуль мы самі сваёй уласнай актыўнасцю, сваім нераўнадушшам не будзем спрабаваць змяніць жыццё да лепшага — у пад'ездзе, у калектыве, у краіне, — на росквіт дзяржавы можна не разлічваць.

Практычны аспект гэтай стажыроўкі відавочны: пераймай і прымяняй. Той жа ўнутраны менеджмент грамадскай арганізацыі, планавання, прыцягнення дабраахвотнікаў, актыўныя метады іх навучання, пошукі сродкаў, формы прапаганды.

На мяне, як прафесіянала, вывучаючага дзяржаўнае ўладкаванне, канструкцыйны лад, механізм дэмакратыі ў ЗША, моцнае ўражанне зрабіў амерыканскі суд. Паўсядзённа праз газеты, тэлебачанне, гутаркі мы пераконваліся ў магутнасці і аўтарытэце гэтай незалежнай галіны ўлады. Амерыканцы з вялікай павагай адносяцца да свайго суда. Яны пераканамістыя, што гэта ўлада надзейна абараняе іх правы.

Чытачам будзе цікава, напэўна, даведацца аб сістэме адукацыі ў ЗША. Акунуўшыся ў акадэмічную атмасферу замежнай ВНУ, няцяжка параўнаць арганізацыю навучальных працэсаў у іх і ў нас. Брайент-каледж, на базе якога праходзіла наша стажыроўка, — адзін з самых прэстыжных, дзе рыхтуюць спецыялістаў для сферы бізнесу.

Навучанне платнае, як , дарэчы, вышэйшая адукацыя наогул — ад 14 да 20 тысяч долараў у год. Адсюль, відавочна, і выдатная матэрыяльная забяспечанасць навучальнага працэсу. Чаму мы пазайздросцілі? Вельмі багатым бібліятэкам, якія аснашчаны па апошняму слову інфарматыкі; магчымасці студэнтам працаваць у Інтэрнэце ў рэжыме свабоднага бясплатнага доступу; зручным аўдыторыям; утульным студэнцкім холам і камфортным кабінетам выкладчыкаў.

Студэнты амерыканскіх каледжаў апранаюцца больш дэмакратычна і сціпла, чым нашы. Паводзяць сябе таксама больш вольна, недапускаючы пры гэтым хамства і непаважальных адносін.

У Брайент-каледжы мы ўбачылі ўзровень адукацыі XXI стагоддзя, да якога, незалежна ад крыніц фінансавання, неабходна імкнуцца і ў нас.

**М.М.ДАЙНЭКА:**

— Безумоўна, паездка ў ЗША — гэта нешта асаблівае, і на мяне, упершыню наведаўшага гэтую супердзяржаву, яна зрабіла вельмі глыбокае ўражанне. А знаёмства з рознымі сферамі жыцця амерыканскага грамадства — эканомікай, навукай, адукацыяй, экалогіяй, культурай — дазволіла бліжэй даведацца аб жыцці амерыканцаў.

Як біёлага, мяне ў большай ступені цікавілі іх адносіны да акаляючага асяроддзя. Запамяталася наведванне многіх фондаў, але асабліва — экалагічнай неўрадавай арганізацыі "Выратаванне заліва" у штаце Род Айлент, дзе налічваецца 30 тыс. чалавек. Сваімі актыўнымі, настойлівымі дзеяннямі яе члены звярнулі ўвагу федэральнага ўрада на стан вады ў заліве. У параўнальна кароткія тэрміны ўдалося аднавіць прыбярэжна-водную расліннасць, віды састаў рыб, мясцовыя жыхары атрымалі яшчэ адно выдатнае месца адпачынку.

Амерыканцы вельмі любяць сваю краіну, а гэта азначае — і сваю вуліцу, і свой дом. Падарожнічаючы на аўтамабілі, назіраў такую карціну: уздоўж трасы — дагледжаныя домікі, у ідэальным парадку дворыкі. І ўсё ж то тут, то там увіхаліся людзі: раўнялі кусты, скошвалі газоны, падсявалі траву, палівалі клумбы. Добра б, падумаў я, такім традыцыям прыжыцца не толькі ў Амерыцы.

А ведаеце, якой экалагічнай праблемай была занепакоена грамадскасць штата Род Айлент у час нашага знаходжання? Аказваецца, у час рамонту школьных памяшканняў была выкарыстана фарба, якая ўтрымлівала шкодныя рэчывы. Праблему гэту ўзвялі да такіх маштабаў, што было вырашана замяніць фарбу на экалагічна бясшкодную, на што з федэральнага бюджэту выдзелілі значныя сумы. Не абышлося і без спонсарскай дапамогі.

Дарэчы, з федэральнага бюджэту на ахову акаляючага асяроддзя накіроўваюцца каласальныя сродкі. Таксама фінансуюцца і многія экалагічныя праграмы. Пры гэтым не варта змяншаць ролю ўсемагчымых рухаў у абароны прыроды. Людзі заўсёды гатовы абараняць свае правы, колькі б часу для гэтага не спатрэбілася. І трэба адзначыць, што небезвынікова.

Не ўсе амерыканцы чулі пра нашу краіну. Гэта дакладна. Але аб чарнобыльскай катастрофе ведаюць. Шчыра нам спачуваюць і прызнаюць, што іх экалагічныя праблемы менш значныя ў параўнанні з нашымі.

На пытанні — чаму ў іх больш чыстая вада, больш чыстае паветра, больш чыстыя вуліцы — я знайшоў адказы ў канцы нашага знаходжання ў ЗША. Яны вельмі простыя: амерыканцы — самі кавалі свайго прыгожага жыцця. Яны самі ўздымаюць праблемы, звяртаюць на іх увагу ўлад і самым актыўным чынам далучаюцца да іх вырашэння.

Вось так бы і ў нас!

*Спытайце ў кнігарнях*

# ПРА ЖЫЦЦЁ МІКОЛЫ ЕРМАЛОВІЧА

Яшчэ ў нядаўнія часы аддрукаваная на машынцы кніга Міколы Ермаловіча пра старажытную Беларусь перадавалася з рук у рукі, як самая вялікая "крамола". "Крамольнасць" яе была ў тым, што аўтар аргументавана, з неабвержнымі фактамі ў руках разгроб векавыя напластаванні вучонай хлусні і паказаў ва ўсёй велічы сапраўдную гісторыю Беларусі. І вось сёння галоўная кніга Міколы Ермаловіча "Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае" выйшла ў сваім поўным, завершаным выглядзе ў выдавецтве "Беллітфонд". Аўтар працаваў над ёй да самых апошніх дзён свайго жыцця, ён паспеў унесці ў яе вёрстку ўсе неабходныя дапаўненні і ўдакладненні. На вялікі жаль, кнігі ўсяго свайго жыцця Мікола Ермаловіч ужо не патрымаў у руках: перад выхадам яе ў свет амаль поўнасцю аслеплага ўжо выдатнага гісторыка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі збіла на вуліцы таксі, і ён памёр у бальніцы.

У кнізе Міколы Ермаловіча раскрыта 500-гадовая гісторыя беларускай сярэдневяковай дзяржавы — Вялікае княства Літоўскае, ад часу яе ўтварэння ў XII стагоддзі да ліквідацыі ў канцы XVIII стагоддзя, калі была падзелена паміж манархічнымі рэжымамі Аўстрыі, Прусіі і Расіі дзяржава Рэч Паспалітая, у якую ўваходзіла на федэратыўных пачатках і Вялікае княства Літоўскае.

Кніга асабліва карысная будзе настаўнікам, студэнтам і вучням старэйшых класаў нашых школ у вывучэнні гісторыі Беларусі.

**К.АЛЯКСАНДРАЎ.**

## СПОРТ СПОРТ

### УЛАДЗІМІР ГАЛАВАЧ — ЧЭМПІЁН ЕЎРОПЫ!

Прыемная навіна прыйшла з Прыбалтыкі: у латвійскім горадзе Елгава прайшоў чэмпіянат Еўропы па пауэрліфтынгу (жым штангі ў стане лежачы).

Намеснік дэкана матэматычнага факультэта па выхаваўчай і спартыўна-масавай рабоце майстар спорту Уладзімір Галавач у вагавай катэгорыі да 90 кг заваяваў залаты медаль.

Трэба адзначыць, што падобнага дасягнення ў нашым універсітэце не было за ўсю яго спартыўную гісторыю.

Хочацца верыць, што мы яшчэ не раз пачуем пра дасягненні Уладзіміра Аляксандравіча і яго вучняў.

### НЕ АБЦЯЖАРВАЦЬ СЯБЕ КЛОПАТАМІ?

У чэрвені ў Гомелі стартаваў чэмпіянат горада па футболу. Зноў арганізатары спаборніцтваў былі здзіўлены адсутнасцю на чэмпіянаце каманды нашага універсітэта (трэнер У.І.Джыоеў).

Прыходзіцца толькі здзіўляцца пазіцыі новай кафедры — спартыўных дысцыплін, — якую ўзначальвае дацэнт Б.М.Зайцаў. Зразумела, лягчэй не прымаць удзелу ў спаборніцтвах, чым абцяжарваць сябе арганізацыйнымі і трэнерскімі клопатамі.

Але вось цікавы факт. Зусім нядаўна на старонках газеты "Гомельская праўда" выказаўся трэнер нашай жаночай гандбольнай каманды дацэнт В.П.Крукоўскі, які скардзіўся на тое, што ў горадзе не праводзіцца гарадская спаборніцтвы па гандболу, а гэта адмоўна ўплывае на рост спартыўнага майстэрства гандбалісткі. Дзіўна, на адной і той жа кафедры трэнеры зборных каманд універсітэта маюць розны падыход да адной і той жа праблемы.

Калі і ў далейшым кафедра спартыўных дысцыплін будзе прымаць пазіцыю пабочнага назіральніка, дык прагрэсу ў гульнявых відах спорту ва універсітэце наўрад ці трэба чакаць.

Як жа ўдасканальваць сваё спартыўнае майстэрства будучым спецыялістам факультэта, у якіх спецыялізацыя — футбол? Яны ж, фактычна, прымаюць удзел у спаборніцтвах толькі раз у год.

Дзіўна, але факт: у чэмпіянаце — і даволі паспяхова — выступаюць студэнты Гомельскага тэхнічнага універсітэта імя П.О.Сухога. А можа там іншыя студэнты? Або іншыя адказныя за развіццё фізічнай культуры і спорту людзі?

**В.МАРЧАНКА,**
**наш спартыўны аглядальнік.**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ У АСПІРАНТУРУ НА 2000 ГОД

Пералік спецыяльнасцей аспірантуры, колькасць месц і форма навучання вызначаюцца планам прыёму.

Паступаючыя ў аспірантуру здаюць конкурсныя ўступныя экзамены па філасофіі, замежнай мове і спецыяльнай дысцыпліне ў аб'ёме дзейнічаючай праграмы для ВНУ. Навучанне ў аспірантуры ажыццяўляецца з адрывам і без адрыву ад вытворчасці. Тэрмін навучання — адпаведна 3 і 4 гады. У аспірантуру прымаюцца асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю і схільнасць да навуковых даследаванняў. Да ўступных экзаменаў у аспірантуру прыёмнымі камісіямі допускаюцца асобы, якія маюць вопыт практычнай працы (у тым ліку апублікаваныя работы) і выпускнікі ВНУ па рэкамендацыі саветаў ВНУ (факультэтаў) пры ўмове **высокага ўзроўню акадэмічнай падрыхтоўкі.**

Прыём і навучанне ў аспірантуры для асоб, якія працуюць у ведамствах (арганізацыях), якія не адносяцца да Міністэрства адукацыі, ажыццяўляецца на падставе дагавораў або кантрактаў паміж арганізацыяй і ГДУ, а таксама для юрыдычных і фізічных асоб. Навучанне ў аспірантуры замежных грамадзян рэгулюецца міждзяржаўнымі пагадненнямі, дагаворамі з арганізацыямі або кантрактамі паміж замежнымі грамадзянамі і ГДУ.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру, падаюць на імя рэктара заяву і прыкладваюць наступныя дакументы:

— асабовы лісток па ўліку кадраў, аўтабіяграфію і 3 фотакарткі памерам 4х6 см;

— спіс і копіі апублікаваных навуковых прац, вынаходніцтваў, патэнтаў і спіс справаздач аб выкананых даследаваннях і распрацоўках; асобы, якія не маюць апублікаваных навуковых прац, вынаходніцтваў і патэнтаў, прадстаўляюць навуковыя даклады (рэфераты) па выбранай тэме ў адпаведнасці са спецыяльнасцю;

— выпіску з пратакола пасяджэння савета (факультэта) вышэйшай навучальнай установы для асоб, якія рэкамендаваны ў аспірантуру непасрэдна па заканчэнні ВНУ;

— копіі дыплома аб вышэйшай адукацыі і выпіскі з заліковай ведамасці;

— выпіску з працоўнай кніжкі;

— копіі дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў (пры наяўнасці ў паступаючых у аспірантуру здадзеных кандыдацкіх экзаменаў);

— пашпарт, дыплом аб заканчэнні ВНУ і дакументы аб здачы кандыдацкіх экзаменаў прад'яўляюцца асабіста.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру па накіраванні арганізацый, дадаткова прадстаўляюць праект дагавора паміж накіроўваючым бокам і арганізацыяй, што ажыццяўляе падрыхтоўку кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі.

Асобы, якія здалі поўнасцю або часткова кандыдацкія экзамены, вызваляюцца ад адпаведных уступных экзаменаў і карыстаюцца перавагай пры залічэнні ў аспірантуру па конкурсу.

Акрамя таго, перавагай на залічэнне пры роўнай колькасці балаў карыстаюцца асобы, якія маюць:

— больш высокую адзнаку на ўступным экзамене па спецыяльнасці;

— апублікаваныя працы;

— стаж працы па спецыяльнасці па заканчэнні ВНУ;

— больш высокую адзнаку за рэферат;

— лаўрэаты рэспубліканскага агляду-конкурсу студэнцкіх навуковых прац і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый.

Асобы, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсу, могуць быць залічаны ў аспірантуру на платнай аснове.

Асобы, залічаныя ў аспірантуру з адрывам ад вытворчасці, забяспечваюцца стыпендыяй. Іншагароднім прадстаўляецца інтэрнат.

**Прыём дакументаў — да 10 верасня 2000 г.**

**Уступныя экзамены праводзяцца з 1 па 30 кастрычніка 2000 г.**

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны, п.4 — 11.

**РЭКТАРАТ.**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СЛУХАЧОЎ НА ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ НА 2000-2001 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Падрыхтоўчае аддзяленне рыхтуе слухачоў да паступлення ў Гомельскі дзяржаўны універсітэт у 2001 годзе на спецыяльнасці дзённай і завочнай форм навучання. Навучанне на падрыхтоўчым аддзяленні платнае і вядзецца па вочнай (дзённай) і вочна-завочнай формах. Для пэўных катэгорый асоб прадугледжаны льготы ў аплаце за навучанне. **Тэрмін навучання — 8 месяцаў.**

Залічэнне на падрыхтоўчае аддзяленне праводзіцца па выніках субяседавання і пасля ўнясення адпаведнай платы за навучанне.

Паступаючыя на падрыхтоўчае аддзяленне падаюць заяву на імя рэктара універсітэта з указаннем абранай спецыяльнасці. Да заявы прыкладваюцца:

— дакумент аб сярэдняй адукацыі (атэстат, дыплом) і яго копія;

— медыцынская даведка формы 086-у;

— шэсць (чорна-белых) фотакартак памерам 3х4;

— копія працоўнай кніжкі (пры наяўнасці);

— даведка аб забруджанасці тэрыторыі радыенуклідамі і іншыя дакументы, якія пацвярджаюць правы на льготы ў аплаце за навучанне.

Пры падачы заяў абавязкова мець пры сабе пашпарт.

**Прыём заяў з 29 жніўня па 9 верасня.**

**Субяседаванне** на ўсе спецыяльнасці вочнай (дзённай) і вочна-завочнай форм навучання праводзіцца **з 12 па 16 верасня.**

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 102 (вучэбны корпус № 5), п.5—11 (падрыхтоўчае аддзяленне). Тэлефон: 57-98-86.

**РЭКТАРАТ.**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

— палітычнай сацыялогіі — дацэнта, ст.выкладчыка;
— давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі — дацэнта;
— рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства — дацэнта; асістэнта (2) за кошт пазабюджэтнай дзейнасці;
— тэорыі і практыкі англійскай мовы — ст.выкладчыка (2);
— беларускай мовы — дацэнта (3);
— нямецкай мовы — ст.выкладчыка;
— матэматычных праблем кіравання — дацэнта;
— аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі — дацэнта;
— хіміі — асістэнта;
— геалогіі і разведкі карысных выкапняў — ст.выкладчыка;
— тэорыі і методыкі фізічнай культуры — дацэнта;
— грамадзянска-прававых дысцыплін — асістэнта;
— псіхалогіі — асістэнта;
— англійскай мовы — ст.выкладчыка;
— аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры — дацэнта, выкладчыка;
— фізвыхавання і спорту — дацэнта;
— педагогікі — ст.выкладчыка.

**Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты эканамічнага факультэта смуткуюць з выпадку заўчаснай смерці вядучага лабаранта кафедры бухуліку і АГД **АСТАНЬКОВІЧ** Святланы Мікалаеўны і выказваюць глыбокае спачуванне яе родным і блізкім.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
**Уладзімір БАЛОГА**

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 471
Падпісана да друку 29.08.2000 г.